


## У НУМАРЫ


| ***<u>Навіны</u>*** | ***<u>Навуковая праца</u>*** |
|---|---|
| **Кніга водгукаў** | **Заслаўе ў беларускай культуры** |
| **Успаміны і персаналіі** | **Старонкі старых газет або згадкі аб Заслаўі** |
| **Наша выстава ў Слуцку** | **Арыгінальныя выявы Заслаўя: цікавосткі з інтэрнэту** |
| **Выстава "Беларусь праваслаўная"** | |


## ***<u>Навіны</u>***

### Кніга водгукаў

**2016**

"В свой день рождения поехала на экскурсию в г. Заславль. Посетив церковь, пришла в музейно-выставочный комплекс. Получила огромное удовольствие, исчерпывающую информацию, много положительных эмоций. Спасибо за работу и доброту" (Кудзелька Марына Валяр'янаўна, г. Мінск, 25 лютага).

"Вялікі дзякуй за цудоўную экскурсію па музею, праведзеную Лябёдкіным А.А. З вялікай падзякай, настаўніца СШ №141 г. Мінска і вучні 9 "Б" класа" (30 мая).

"Огромную благодарность выражаем сотрудникам музея Антонине Ивановне [Арцем'ева] и Тамаре Андреевне [Гудына] за интересные и содержательные рассказы об истории замечательного города Заславля" (госці з Расійскай Федэрацыі, 19 чэрвеня).

"Очень тронуты добротой, теплом, светом любви к Родине сотрудника музея, экскурсовода Маргариты [Шляхціцава]! Её интересный экскурс возвращает нас в Истинную жизнь, настоящую, которая близка каждому

человеку! Экспозиция напоминает нам, что мы в ответе за будущее нашей Родины! Низкий поклон и многая и благая лета!!!" (ансамбль "Цімпан" ("Тимпан"), 28 чэрвеня).

"Благодарим музей "Заславье" за приём. Тамара Андреевна [Гудына] очень интересный и замечательный экскурсовод. Спасибо за экскурсию на городище "Вал" (УП "Праектны інстытут "Брэстгіпразем", 23 ліпеня).



*Кніга водгукаў музея-запаведніка,*
*якая захоўваецца ў музейна-выставачным комплексе*

"От имени ветеранов филиала №614 ОАО "АСБ "Беларусбанк", выражаем слова искренней благодарности экскурсоводу Шляхтицевой Маргарите Олеговне за очень интересную познавательную экскурсию, из которой мы много узнали об истории возникновения нашего города Заславля, истории Полоцкого княжества, Рогнеды, Софии Полоцкой. Очень интересной и познавательной экскурсии о развитии нашего Белорусского музейного искусства. Спасибо" (старшыня Савета ветэранаў Мінскага раёна і філіяла №614 ААТ "АСБ "Беларусбанк", 5 кастрычніка).

"У вас цудоўны музей і такія ветлівыя супрацоўніцы! Дзякуй, што робіце такую важную справу нягледзячы ні на што. Поспехаў вам!" (30 кастрычніка).

"Анне Сергеевне [Кошаль] огромное спасибо за интереснейшую экскурсию. Профессионально, познавательно. Анна Сергеевна –

исключительно обаятельна. Грамотная речь, глубокие знания - это очевидно" (госці з Мінска, 27 лістапада).

### Успаміны і персаналіі

*Працягваем друк успамінаў Аляксандра Калбаскі (пачатак у №9). Дадаткова адзначаем, што матэрыял, адлюстраваны ва ўспамінах, цэласна сфармаваўся ў 1999-2000 гг., таму не ўсе закранутыя ў ім аспекты могуць цалкам адпавядаць сённяшняму бачанню спецыялістаў музейнай справы. Матэрыял друкуецца фактычна без зменаў (або з мінімальнымі), апрача, галоўным чынам, захадаў скарачэння аб'ёму [Рэд.]*.

***Як пачыналася***

**МУЗЕЙНЫ НАВІГАТАР,**

**ЦІ ПАРАДЫ МУЗЕЙНАГА ДЫРЭКТАРА**

**Якую перыёдыку пажадана час ад часу праглядаць, каб трымаць сябе ў прафесійнай форме?**

**ICOM News**

Штоквартальны бюлетэнь Міжнароднага Савету Музеяў (ISSN 0-018-8999). Выдаецца на ангельскай, французскай і нямецкай мовах.

International Council of Museums

Maison de l’UNESCO

1 rue Miolis

75732 Paris Cedex 15

France

**Museum News**

Выдаецца AAM адзін раз у два месяцы (ISSN 0-027-3996)

American Association of Museums

1575 Eye Street N.W.

Suite 400

Washington, D.C. 20005

USA

**Museum Journal**

Найбольш сур'ёзнае штомесячнае выданне Музейнай Асацыяцыі Вялікабрытаніі (ISSN 0-027-416X), якое мае на мэце прадстаўляць сусветнай музейнай грамадскасці падзеі, агляды, тэарэтычныя артыкулы важныя для штодзённага жыцця і дзейнасці музеяў і галерэй краіны.

Museum Journal

42 Clerkenwell Close

London ECIR OPA

United Kingdom




*Аляксандр Калбаска.*
*Прэзентацыя кнігі "Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя", 2000 г.*

**Muse**

Штоквартальны часопіс Канадскіх музеяў (ISSN 0-820-0165), выдаецца на ангельскай і французскай мовах Канадскаю Музейнаю Асацыяцыяй.

Canadian Museum Association

280 Metcalfe Street

Suite 400

Ottawa, Ontario

Canada K2P 1R7

**Museum (UNESCO)**

Штоквартальнае выдаецца ЮНЭСКА (ISSN 0-027-3996) у Парыжы. Прадстаўляе сабою сусветны форум музеяў усіх тыпаў. Ангельскае выданне друкуецца ў Оксфардзе, французскае і іспанскае – у Парыжы, арабскае – у Каіры, расійскае – у Маскве.

Subscription Department

Marson Book Servise

PO Box 87

Oxford OX2 0DT

United Kingdom




*Як выглядае базавая схема заходняга музея*

**Мир музея**

Расійскае выданне выдаецца з 1931(да 1993 выходзіў пад назваю "Савецкі музей") раз у два месяцы. Заснавальнік – Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі.

пл. Смаленская – Сенная , 27-3

Москва 119121

“**Музейныя сшыткі”**

Тэматычныя навукова-метадычныя зборнікі, што выходзяць на базе Беларускага інстытута праблем культуры з 1996 года.

вул. Каліноўскага, 12

Мінск 220086

Беларусь




*Як схематычна праілюстраваць бліжэйшае асяроддзе і ўзаемаўплыў музея*




*З якіх этапаў складаецца жыццёвы цыкл музейнай экспазіцыі*

**Сутнасць этапаў:**

**I. КАНЦЭПТУАЛЬНАЯ ФАЗА:**

1.1. Канцэптуальны этап:

Асноўная актыўнасць:

- сартыроўка ідэй і адбор, якою займацца.

Арганізацыйныя захады

- асэнсаванне ідэй адносна місіі музея і патрэб наведвальнікаў;

- адбор экспазіцыйных ідэй для распрацоўкі;
- ацэнка рэсурсаў, патрэбных для выканання праекта.

Вынікі:

- стварэнне схематычнага плана экспазіцый;
- усведамленне патэнцыяльных рэсурсаў.

**II. РАБОЧАЯ ФАЗА:**

2.1. Стадыя планавання:

Асноўная актыўнасць:

- вызначэнне мэт экспазіцыі;
- акрэсленне фабулы;
- канструяванне (задумванне) экспазіцыі;
- распрацоўка адукацыйнага плана;
- распрацоўка плана рэкламы (пры неабходнасці).

Арганізацыйныя захады:

- ацэнка кошту;
- пошук крыніц фінансавання ці рэсурсаў;
- складанне бюджэту;
- вызначэнне задач.

Вынікі:

- план работы над экспазіцыяй;
- план адукацыйнай дзейнасці на базе экспазіцый.

2.2. Вытворчая стадыя:

Асноўная актыўнасць:

- пабудова экспазіцыйных раздзелаў;
- мантаж і інсталяцыя прадметаў у экспазіцыі;
- распрацоўка адукацыйных праграм;
- запуск рэкламнага плана ў дзеянне.

Арганізацыйныя захады:

- кантроль за выкарыстаннем рэсурсаў;
- нагляд за тэмпамі развіцця.

Вынікі:

- публічнае прадстаўленне экспазіцыі;
- выкарыстанне адукацыйных праграм разам з экспазіцыяй.

**III. ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ ФАЗА**

3.1. Стадыя дзейнасці:

Асноўная актыўнасць:

- пастаяннае выкарыстанне экспазіцый;
- прадстаўленне адукацыйных праграм;
- агляд наведвальнікамі;
- арганізацыя ўтрымання экспазіцый;
- забеспячэнне захаванасці экспазіцыі.

Арганізацыйныя захады:

- аплата рахункаў.

Вынікі:

- дасягненне экспазіцыйных мэт;
- перасцярога калекцый ад псавання.

3.2. Завяршальная стадыя:

Асноўная актыўнасць:

- дэмантаж экспазіцыі;
- вяртанне прадметаў у сховішча.

Арганізацыйныя захады:

- балансаванне рахункаў.

Вынікі:

- закрыццё экспазіцыі;
- апека над калекцыямі;
- чыстка і рамонт выставачных плошчаў.

**IV. АЦЭНАЧНАЯ ФАЗА**

4.1. Ацэначная стадыя:

Асноўная актыўнасць:

- ацэнка экспазіцыі;

- ацэнка працэсу распрацоўкі і функцыянавання экспазіцыі.

Арганізацыйныя захады:

- падрыхтоўка выніковай справаздачы.

Вынікі:

- шляхі паляпшэння музейнага прадукта і ўдасканаленне тэхналагічнага працэса.

*Аляксандр Калбаска, прафесар ЕГУ,*
*дырэктар Запаведніка ў 1988-1994 і 1997-2000 гадах,*
*aliaksandr.kalbaska@ehu.lt*

## Наша выстава ў Слуцку

Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе", як гэта адзначалася ў нашых ранейшых матэрыялах, вядзе актыўную выставачную дзейнасць не толькі на сваіх плошчах, але і прадстаўляе свае выставы для экспанавання выязным чынам – на базе іншых устаноў. Гэтак, напрыклад, у лютаўскім нумары нашай газеты (№22) прысутнічала згадка аб выставе "Чароўныя мелодыі гліны" з прадметамі з фондаў музея-запаведніка, якая экспанавалася ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры ў Мінску з 7 лютага да 13 сакавіка 2022 г. Зараз жа вялікая і прадстаўнічая выстава з прадметамі з фондаў музея-запаведніка дзейнічае ў г. Слуцку Мінскай вобласці.

Выстава, арганізаваная ў Слуцкім краязнаўчым музеі (ў філіяле "Галерэя мастацтваў ім. У.С. Садзіна"), уяўляе сабой часовую экспазіцыю пад назвай "Беларускія маляванкі", якая аздоблена арыгінальнымі дыванамі-маляванкамі ("маляванкамі") з найбагацейшай у Беларусі калекцыі "маляванак" Заслаўскага музея-запаведніка. Для Слуцка гэта часовая экспазіцыя вельмі важная тым, што ў яе склад уваходзяць, у ліку іншых, і дываны Алены Кіш, якая паходзіла родам са Случчыны, дзе і малявала людзям на замову. Прысутнічаюць таксама дываны Язэпа Драздовіча, Ядзвігі Вайцешык, Генадзя Кузаўкова, іншых аўтараў, як вядомых нам, так і невядомых.

Урачыстае адкрыццё выставы адбылося 1 красавіка пры непасрэдным удзеле супрацоўнікаў нашага музея запаведніка: намесніцы дырэктара па навуковай працы, загадчыцы навукова-экспазіцыйнага аддзела І.В.

Сабалеўскай і галоўнага захавальніка фондаў А.К. Рака. Пабачыць часовую экспазіцыю “Беларускія маляванкі” можна будзе па 31 мая. Гэта добрая нагода наведаць старажытны Слуцк. Не прамініце завітаць на выставу! *****



*Урачыстае адкрыццё выставы “Беларускія маляванкі” ў Слуцку. Па правым баку стаяць А.К. Рак і І.В. Сабалеўская (фота ўзята з Партала музеяў Беларусі)*

***** *Даведацца больш можна на Партале музеяў Беларусі, выкарыстаўшы наступную спасылку: http://museum.by/node/61159*

## Выстава "Беларусь праваслаўная"

Запрашаем Вас у музей-запаведнік “Заслаўе” на выставу “Беларусь праваслаўная”. Экспазіцыя прымеркавана да свята Вялікадня і 1030-годдзя заснавання першай на тэрыторыі сучасных беларускіх зямель праваслаўнай Полацкай епархіі.

У 1992 годзе ўрачыста было адзначана яе 1000-годдзе. Але і сучасны юбілей мае вялікае значэнне, бо апошняе 30-годдзе – значны этап у гісторыі развіцця беларускага праваслаўя. У гэтыя гады адбылося адраджэнне царкоўнага жыцця, вяртанне беларусаў да духоўных асноваў, якія былі важныя для нашых продкаў. 1030-годдзе – падстава асэнсаваць нанова гістарычны шлях праваслаўя на беларускіх землях і асабліва паразважаць аб працэсах, якія адбываліся на працягу апошніх дзесяцігоддзяў.



*Віктар Данілаў і Анастасія Балыш пасля супольнай працы па мантажы выставы*

Экспазіцыя выставы ўключае ў сябе творы мастакоў Еўразійскай мастацкай садружнасці, а таксама гістарычныя праваслаўныя артэфакты з прыватных калекцый і фонду Заслаўскага музея. Карціны ўдзельнічаюць у дабрачынным продажы – зборы сродкаў на лячэнне дзяцей з цяжкімі захворваннямі.

*З павагай, протаіерэй Мікалай Мазгоў*
*і куратар выставы Анастасія Балыш*

*[На выставе будзе цікава не толькі дарослым, але і дзецям. Часткай выставы з'яўляецца сапраўдны храмавы звон, у які можа пазваніць кожны, каб пацешыць душу, адчуць сувязь з адзінай хрысціянскай сям'ёй пад провідам усемагутнага Бога. Выстава дзейнічае на базе музейна-выставачнага комплекса, які знаходзіцца па адрасе вул. Рынкавая, 4, г. Заслаўе; тэрмін дзеяння: 12.04-04.05.2022 г. – Рэд.].*

## ***Навуковая праца***

### Заслаўе ў беларускай культуры

У розных мясцінках Беларусі перыядычна адбываюцца пленэры мастакоў, аб'яднаных пэўнай задумай або тэматыкай. Але, далёка не ў кожнай з гэтых мясцінак яны з'яўляюцца штогадовымі, традыцыйнымі.

Штогадовыя сталыя пленэры – гэта запамінальная з'ява, падзея ў беларускай культуры, якая ўзбагачае скарбонку айчыннага і сусветнага мастацтва, духоўна насычае яго аматараў. Заслаўе, у гэтым сэнсе, мае шчасце: з 2018 г. у ім праводзіцца Міжнародны пленэр мастакоў "Заслаўскі Спас", якіх, на дадзены момант, ужо адбылося чатыры.



*Завяршальныя моманты IV Міжнароднага пленэра "Заслаўскі Спас", Заслаўе, 2021 г.*

Запачаткаваны і заснаваны пленэр "Заслаўскі Спас" быў дзякуючы супрацы прыхода Спаса-Праабражэнскага Сабора ў Заслаўі і непасрэдна айца Мікалая Мазгова з мастачкай Анастасіяй Балыш, якая таксама з'яўляецца прыхаджанкай згаданага храма, яе сям'я цесна звязана з хрысціянскім служэннем на працягу пакаленняў. Мэтай і ідэяй пленэра было і застаецца аб'яднанне мастакоў і аматараў мастацтва ў імкненні да святла і дабрыні. Тэматычна работы творцаў звычайна звязаны з праваслаўным святам Яблычнага Спаса, з Заслаўем, паядноўваюць у сабе элементы першай і другой тэм, пішуцца ў іншай тэматычнай афарбоўцы, з галоўнай умовай, каб у іх сюжэтах прысутнічала святло і дабрыня, традыцыйныя хрысціянскія каштоўнасці.

У пленэры "Заслаўскі Спас" удзельнічаюць як прафесійныя мастакі, так і мастакі-вучні, мастакі-аматары, што ствараюць свае работы ў розных стылях, як дарослыя, так і дзеці – ніякіх кваліфікацыйных, узроставых і стылявых абмежаванняў, толькі наяўнасць ахвоты ствараць разам. Няма

абмежаванняў і ў геаграфічным аспекце: як заўважалася вышэй, пленэр гэты – з'ява Міжнароднага кшталту. У ім прымаюць удзел мастакі з Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны... І нават каранавірус не здолеў зашкодзіць гэтай добрай традыцыі: мастакі, якія не змаглі прыбыць на пленэр, дасылалі свае работы поштай.

Асаблівай рысай пленэра "Заслаўскі Спас" з'яўляецца яго скіраванасць да дабрачыннасці, эмацыйнай творчай камунікацыі, усебаковага развіцця чалавека як асобы, яго імкненне духоўна напоўніць суайчыннікаў, абуджаць у сэрцах людскасць і спагаду. Многія працы, створаныя мастакамі ў межах пленэра, прадаюцца, а грошы з іх продажу ідуць на дапамогу хворым дзецям. Работы мастакоў дэманструюцца як пры Заслаўскім Спаса-Праабражэнскім кафедральным Саборы і ў яго ўнутранай прасторы, так і на спецыяльных выставах у Заслаўскім музеі-запаведніку. Сузіранне твораў мастакоў – сапраўднае свята для гледачоў, калі пра сюжэты-задумы можна даведацца непасрэдна ад аўтараў, адчуць іх эмацыйны стан, адбіткі пачуццяў.

"Заслаўскі Спас" – сапраўдная падзея ў беларускай культуры, вартая ўвагі, падтрымкі і захавання, падзея, якая падкрэслівае асаблівую ролю Заслаўя ў жыцці нашай Айчыны.

## Старонкі старых газет або згадкі аб Заслаўі

На цікавую і арыгінальную інфармацыю, у тым ліку – на гістарычную, можна натрапіць цалкам выпадкова, калі гартаеш сваю стужку навін у сацыяльных сетках. У выпадку гістарычнай інфармацыі асабліва карыснай з'яўляецца сацыяльная сетка "facebook", у якой маюць акаўнты прафесійныя навукоўцы, робяць допісы (пасты), адпаведна тэматыцы сваіх навуковых пошукаў і цікаўнасцяў. Апрача таго, ёсць у facebook і адмысловыя асяродкі – суполкі (групы) гістарычнай скіраванасці, якія збіраюць і публікуюць адпаведны кантэнт. Да такога кшталту асяродкаў адносіцца і суполка "Культурная спадчына Габрыелі Пузыны ў Беларусі". Габрыеля Пузына – творчая асоба, якая родам паходзіла з Вільні, была паэткай і пісьменніцай, у ліку знаёмых мела такога вядомага творцу XIX ст. як Уладзіслаў Сыракомля. У шэрагу разнастайных матэрыялаў па гісторыі Беларусі ў стужцы суполкі, прысвечанай спадчыне Габрыелі Пузыны, сустракаюцца і арыгінальныя матэрыялы па гісторыі Заслаўя, напрыклад, – польскамоўныя артыкулы з перыядычных выданняў к. XIX-п. XX стст. (першы надрукаваны ў №23). Другім з іх ліку прапануем Вашай увазе артыкул за 1901 г., які падаецца ніжэй у перакладзе на беларускую.



Zmarli.

S. p. Ludomir Prószyński.

(Wspomnienie pozgonne).

Niepostrzeżenie zmarł przed kilku dniami w Warszawie ś. p. Ludomir Prószyński, po którym dobre i długotrwałe pozostanie wspomnienie. Syn zamożnych rodziców, właścicieli dóbr Zasław, w gub. mińskiej, ś. p. Ludomir Prószyński wytworne otrzymał wychowanie i własną pracą doszedł do wysokiego wykształcenia. Zbiegiem różnych okoliczności utraciwszy znaczniejszą część majątku, zmarły osiadł w Warszawie i tu oddawał się z zapałem studyom nad dziejami Słowian południowych. Owocem tych studyów była praca, wydana przed kilkunastu laty, p. t. „Bośnia i Hercegowinna“. Pisywał również artykuły i przetłómaczył broszurę „Zawojowanie świata przez żydów“.

Prawy charakter i szlachetny entuzyazm cechowały zawsze ś. p. Ludomira Prószyńskiego, który też, czując się coraz słabszym, postanowił zamknąć życie czynem pięknym. Jak donosi jedno z pism, w testamencie, spisanym na kilka lat przed śmiercią, przeznaczył całe mienie swoje, w części uratowane z wielkiego majątku, a w części zaoszczędzone z pracy, na cel pożyteczności publicznej. Zapis ten wynosi 50,000 rb., odsetki zaś wypłacane być mają „spracowanym weteranom literatury i dziennikarstwa polskiego“.

Wykonawcą i kuratorem zapisu ustanowił ś. p. Ludomir Prószyński Radę miasta Krakowa, pragnąc w ten sposób zapewnić możliwą trwałość fundacyi. Legat zacnego męża złożony został w krakowskiej kasie oszczędności.

Ś. p. Ludomir Prószyński dożył lat 67.

*Артыкул з выдання “Газета Польская” (1901 г.), прысвечаны памяці Людаміра Прушынскага*

“ПАМЕРЛІ

**ЛЮДАМІР ПРУШЫНСКІ З ЗАСЛАЎЯ**

(пасмяротны ўспамін пана С. Собаса)

Некалькі дзён назад непрыкметна памёр у Варшаве святой памяці Людамір Прушынскі, аб якім застанецца добры і трывалы ўспамін. Сын заможных бацькоў, землеўладальнікаў у Заслаўі Мінскай губерні, святой памяці Людамір Прушынскі атрымаў выдатнае выхаванне і ўласнай працай дайшоў да высокай адукаванасці. У выніку розных акалічнасцяў лёсу, страціўшы значную частку маёнтку, памерлы асеў у Варшаве і тут з запалам аддаўся вывучэнню гісторыі паўднёвых славян. Вынікам гэтага вывучэння была праца, выдадзеная каля дваццаці год назад, пад назвай “Боснія і Герцагавіна”. Ён таксама пісаў артыкулы і пераклаў брашуру “Заваяванне свету яўрэямі”.

Справялівы характар і шляхетны знтузіязм заўсёды характарызавалі святой памяці Людаміра Прушынскага, які, калі адчуў, что пачаў слабець, пастанавіў завяршыць жыццё прыгожым учынкам. Як паведамляе адзін

часопіс, ён у сваім тэстаменце (завяшчанні), напісаным за некалькі год да смерці, прызначыў усю сваю маёмасць, часткова ацалелую з вялікага бацькоўскага маёнтку, а часткова сабраную ўласнай працай, на мэту грамадскай карысці. Запіс гэты складае 50 тысяч рублёў, а працэнты ад іх павінны выплочвацца “спрацаваным ветэранам польскай літаратуры і журналістыкі”.

Выканаўцам і куратарам гэтага свайго запісу святой памяці Людамір Прушынскі прызначыў Раду горада Кракава, імкнучыся такім спосабам гарантаваць трываласць фонду. Юрыдычныя дакументы аб гэтым былі перададзены ў Кракаўскую ашчадную касу.

Святой памяці Людамір Прушынскі дажыў да 67 гадоў” *****.

Людамір Прушынскі – прадстаўнік роду Прушынскіх. Род Прушынскіх быў уласнікам Заслаўя з 1827 г., калі паны Пшаздзецкія прадалі Заслаўе і ваколіцу Міхаілу Прушынскаму, які з’яўляўся падкаморыем ігуменскім, да 1867 г., калі Заслаўе стала ўласнасцю паноў Хамянтоўскіх. Зыходзячы з таго, што некралог па Людаміры Прушынскім напісаны ў 1901 г., а пражыў ён 67 гадоў, маем год яго нараджэння – 1834. Тады Заслаўе і ваколіца яшчэ належалі Прушынскім, таму можам меркаваць, што Заслаўскі маёнтак быў тым месцам, дзе Людамір пабачыў свет і ўзмужнеў.

**** “Газета Польская”, № 211, 1901 г. (“Gazeta Polska”, № 211, 1901 г.)***

**Арыгінальныя выявы Заслаўя: цікавосткі з інтэрнэту**

Прыемна заўважаць станоўчыя выпадкі, калі людзі гуртуюцца на глебе гісторыі, на глебе любові да свайго роднага куточку, дзеляцца ёю з іншымі і стараюцца даведацца больш і веды гэтыя для ўсіх даступнымі робяць. Зараз, як часы маем інфарматызаваныя, гэта, натуральна, адбываецца праз інтэрнэт, у тым ліку – праз мэсэджэры.

Такім добрым прыкладам для Заслаўя з'яўляецца агульнадаступная суполка ў вайберы пад назвай “Заславль. Архив фотографий”, якая, фактычна, займаецца зборам і папулярызацыяй фотагісторыі (візуальнай гісторыі) Заслаўя, хай і на аматарскім узроўні, але ўсё адно гэта вельмі карыснае пачынанне, дзякуючы якому прачынаецца большы інтарэс да свайго краю, у перспектыве можа быць створаны сайт з агульнадаступным фотаархівам – зборам візуалізаванай гісторыі Заслаўя. Тут кожны можа пакінуць фотаздымкі са сваіх архіваў або выпадкам знойдзеныя ў інтэрнэце, згодна з акрэсленай тэматыкай суполкі, задаць пытанні па сваіх інтарэсах былой забудовы Заслаўя і атрымаць адказ ад тых, хто даўно тут жыве і многае ведае з уласных успамінаў.



*Заслаўе, краявід, 1926 г.*

Нядаўна ў згаданай вышэй суполцы былі апублікаваны тры цікавыя фотаздымкі Заслаўя, якія адносяцца да міжваеннага перыяду і перыяду нямецкай акупацыі: да 1926, 1928 і 1941-1944 гадоў суадносна. Тут жа ў газеце мы прапаноўваем іх Вашай увазе, шаноўныя чытачы, бо ўпэўненыя, што для многіх гэтыя выявы яшчэ невядомыя.



*Заслаўе, краявід, 1928 г.*

Зараз у суполцы “Заславль. Архив фотографий” у мэсэджэры “вайбер” амаль 400 удзельнікаў. Не прамініце далучыцца да яе, калі маеце цікавасць да мінуўшчыны Заслаўя, каб даведацца больш. Калі ж маеце ў наяўнасці фотаздымкі Заслаўя розных гадоў, а таксама – жаданне падзяліцца сваімі здабыткамі і ведамі з іншымі, таксама не прамініце далучыцца да гэтай суполкі. Прыемна, калі справай захавання і пашырэння гістарычных ведаў займаюцца не толькі тыя, хто спецыялізуецца ў дадзенай сферы, але і аматары, што знаходзяць у гэтым жывы інтарэс і перадаюць яго іншым.



*Заслаўе, 1941-1944 гг., часы нямецкай акупацыі*

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія Зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.